адсутныя ў сучаснай беларускай паэзіі цвёрдыя формы і віды верша, такія як гашма, касыда, кыта, ліпаграматычны верш, лэ, пантарым, сіцыліяна, фард, дайна, дойна, дубейці, каламыйка, мураба, мусаба, мусадас, мусаман, мусамат, мухамас, пеон, фрашка, шаіры і інш., што фактычна з'яўляецца яго вельмі прыкметным унёскам у жанрава-страфічнае багацце і разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі.

## XIX СТАГОДДЗЕ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ

*Бахановіч Н. Л. (Минск, Беларусь)*

Абнаўленне карты Цэнтральнай і Паўднёва-ўсходняй Еўропы ў канцы XVIII ст., у межах якога адбыўся ў тым ліку і трохэтапны падзел Рэчы Паспалітай паміж трыма суседнімі краінамі, засведчыла вызначальную па сваіх наступствах змену палітычнага статусу беларускай зямлі. XIX ст. у айчыннай гісторыі адметнае маштабнымі гістарычнымі падзеямі: вайна 1812 г., з'яўленне і ліквідацыя царскімі ўладамі моладзевага руху філаматаў-філарэтаў (канец 1810-х–1820-я гг.), два паўстанні (1830–1831 і 1863–1864 гг.). Названыя ўражальныя і неабвержныя факты ўздзейнічаюць на светаадчуванне, светабачанне і светаразуменне тагачасных грамадзян, а г.зн. і на мастацтва слова, дзе ў адным духоўна-культурным полі з польскамоўнай плынню, нарэшце, пасля працяглай паўзы, зноў пачынае фігураваць беларускамоўная літаратура.

Развіццё літаратурнага працэсу на беларускай і польскай тэрыторыях у гэты перыяд стымулююць як мінімум тры моўныя сістэмы – беларуская, польская і руская, праз пасрэдніцтва якіх на яго ўздзейнічае і культура іншых еўрапейскіх народаў. Сярод акрэсленага комплексу «каталізатараў» развіцця нацыянальнага мастацтва слова дамінантную ролю выконваў польскі па прычыне супольнасці папярэдняга гістарычнага шляху і наяўнасці грунтоўнага агульнага пласта – шэрагу беларускіх твораў на мове суседняга народа. Пры гэтым у структуру літаратурных тэкстаў ўваходзяць спрадвечны этнічны матэрыял – фрагменты гісторыі, элементы вуснай народнай творчасці, маркёры матэрыяльна-побытавай культуры і г.д. У. Мархель з гэтай нагоды развважае: «Польскамоўная творчасць аўтараў беларускага паходжання мела трансфармацыйны характар, бо беларускую ментальнасць яна пераводзіла ў рэчышча польскай мовы, у літаральным сэнсе перакладала на польскую мову» [1, с. 111].

Дзякуючы магчымасці такога «перакладу», у літаратурным працэсе прысутнічалі ўнікальныя творы, якія, на жаль, затым былі выкінутыя з яго па прычыне моўнай «неадпаведнасці». Пераважная іх частка створана прадстаўнікамі шляхецкага саслоўя, якія апісваюць сваё асяроддзе і яму ж у асноўным адрасуюць свае мастацкія тэксты. Фарміраванне поўнай і цэласнай карціны жыцця айчыннай інтэлігенцыі ў гэты перыяд прадстаўляе цікавасць

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

па той прычыне, што менавіта яна была флагманам – асноўным носьбітам беларускай нацыянальнай ідэі. Напрыклад, польскамоўная беларуская проза (Я. Баршчэўскі, І. Ходзька, І. Яцкоўскі, А. Плуг, Э. Масальскі, В. Савіч-Заблоцкі і інш.) дазваляе сёння зрузумець, наколькі складаным быў лёс беларускай, а таксама польскай, расійскай, украінскай, літоўскай, шляхты. Знікненне гэтага саслоўя ва ўсходнеславянскай гісторыі прынята трактаваць у якасці даволі рэзкага, але заканамернага і цалкам справядлівага віражу гісторыі. За ўвасабленнем у перыяд Адраджэння і далейшым навуковым аналізам «мужыцкіх» асноў беларускай нацыі, за ўмацаваннем савецкай уладай культа пралетарыяту шляхта была забытая, разам з яе праблемамі і, самае галоўнае, крызісамі.

Уплыў беларускага дыскурсу на польскую літаратуру ў XIX ст. праяўляўся ў творчасці аўтараў, так ці інакш звязаных з айчыннымі землямі, аднак «крэсы» перамясціліся ў разрад былых польскіх тэрыторый. Тое, што ў XVI і XVII стст. адпавядала канкрэтнай рэчаіснасці, звязанай з геапалітычным палажэннем Рэчы Паспалітай абодвух народаў, у наступных стагоддзях пераходзіць да катэгорыі міфаў, але заўсёды ў глыбокім для нацыянальнай свядомасці значэнні [2, с. 15]. Былыя «крэсы» склалі гродзеншчына, віленшчына і палессе, у той час як уласна беларускімі тэрыторыямі лічыліся віцебская, магілёўская і ўсходняя частка мінскай губерній. Нёман выконваў ролю сімвалічнай мяжы паміж беларускім і польскім народамі, на адным з бакоў якой узніклі ўнікальныя культурныя з'явы еўрапейскага маштабу. У такой сувязі надзвычай ілюстратыўным бачыцца прыпісанае Ю. Пілсудскаму і шырока распаўсюджанае параўнанне Польшчы з абаранкам, у якім усё самае лепшае месціцца па краях. Не маючы радзімы ў выглядзе дзяржавы з дакладна акрэсленымі палітычнымі межамі, таленавітыя выхадцы з крэсаў ідэнтыфікавалі сябе неадназначна, адкрытыя як да свайго, так і да чужога. Творчыя асобы, народжаныя і выхаваныя на геаграфічным памежжы, адчувалі і па-мастацку выяўлялі ўласную прыналежнасць да феномену духоўнага памежжа.

Першай знакавай культурнай падзеяй стаў рамантызм, які ўзнік у 20–30-х гг. у Віленскім універсітэце ў асяроддзі філаматаў і філарэтаў. Стваральнікамі гэтага мастацкага метаду былі пераважна выхадцы з беларуска-літоўскіх крэсаў: Я. Чачот, Т. Зан, Э. Адынец, А. Міцкевіч і інш. Распрацоўцы імі айчыннага дыскурсу ў польскай і беларускай літаратурах спрыяла сама «прырода» рамантычнага метаду, таму што прадугледжвала зварот да мінулага і фальклору. Блізкімі для літаратараў сталі гісторыя Вялікага княства Літоўскага і вусная народная творчасць на прасторах літоўска-беларускіх крэсаў. Асаблівая роля ў распрацоўцы рамантызму належыць польска-беларускаму аўтару А. Міцкевічу, што "ў эпілогу да «Пана Тадэвуша» акрэсліў выгнанчы дух гэтай плыні. Беларускі дыскурс у польскай літаратуры XIX ст. выявіўся ў рамантычным матыве раз'яднанасці з «малой радзімай» і адначасова духоўнай сувязі з ёй. Разам з нашымі землякамі, рамантызм у польскай літаратуры прадстаўлены імёнамі Ю. Славацкага, Л. Штырмера, Ц. Норвіда, А. Фрэдры і інш.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Другой польскай культурнай падзеяй, стымуляванай беларускім фактарам, стаў варшаўскі пазітывізм – літаратурна-грамадскі рух 60–80-х гг. Яго прадстаўнікі прапагандавалі неабходнасць развіцця польскіх земляў мірным шляхам – служэння: пашырэннем асветы сярод народа, працай на карысць айчыны. У такой літаратуры сцвярджаў сябе новы герой – чалавек нізкага сацыяльнага статусу (рамеснік, гандляр, акцёр, селянін і г.д.), часта прадстаўлены як носьбіт асноў маральнасці і духоўнасці. С. Пігонь у выяўленні і індывідуалізацыі такога героя адзначыў асаблівую ролю Э. Ажэшкі, якая амаль усё жыццё правяла на Гродзеншчыне. «Яе «Хам» выступае тут пазіцыяй гістарычнай. Пісьменніца не назвала апавяданне «Рыбак», – разважае даследчык, – акрэсліла героя словам, якое стварала кантраст, афарбоўвалася горыччу прыніжэння» [3, с. 247]. Побач з Э. Ажэшкай у рэчышчы польскага рэалізму беларускую тэму асвятлялі Г. Сянкевіч, М. Канапніцкая, М. Радзевіч, Ю. Вайсенгоф і інш. Айчынная факталогія паўставала ў іх творах таму, што, бываючы ці жывучы за Нёманам і трымаючыся думкі аб аднаўленні Польшчы ў межах Рэчы Паспалітай, яны не заўсёды выразна размяжоўвалі гэтыя асобныя народы.

Такім чынам, менавіта адарванасць рамантыкаў ад малой радзімы – беларускай зямлі, паўплывала на настальгічныя адносіны да яе, уласцівыя польскай літаратуры наступных стагоддзяў, таму што «якраз тут быў пакладзены пачатак сакралізацыі вялікай і малой Радзімы» [4, с. 168]. Побач з тым, у нашых суседзей паняцце крэсаў як іх правінцыі, пачынаючы прыкладна з 80-х гг., убірае непарушаныя этычныя і культурныя эталоны, якія вызначаюць сферу польскай самаідэнтыфікацыі [5, с. 10–11]. У выніку беларускі дыскурс асвятляецца не ў якасці геаграфічнага прыдатку да тэрыторыі Польшчы, а як адметная духоўная прастора, дзе сканцэнтраваны станоўчыя традыцыі многіх пакаленняў.

Дагэтуль існуюць розныя думкі на тэму таго, ці XIX ст. прадстаўляе агульны беларуска-польскі літаратурны працэс, ці існавалі дзве асобныя літаратуры. Безумоўным выступае толькі факт узаемнага ўплыву беларускага і польскага фактараў: польская мова дала прыдатную ў тагачасных абставінах абалонку для ўвасаблення айчыннай рэальнасці, беларускі дыскурс у сваю чаргу духоўна напоўніў ключавыя культурныя з'явы нашых геаграфічных суседзей.

## Літаратура і крыніцы

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. – Т. 2 : Новая літаратура: другая палова XVIII–XIX стагоддзе. – Мінск, 2010.
2. Uliasz, S. Literatura kresów – kresy literatury : Fenomen Kresów Wschodnich w literaturze polskiej dwudziestoliecia międzywojennego. – Rzeszów, 1994.
3. Pigoń, St. Na drogach kultury ludowej: Rozprawy i studia. – Warszawa, 1974.
4. Штэйнер, І.Ф. Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя. – Мінск, 2002.
5. Paczoska, E. Odkrywanie prowincji – w kręgu doświadczeń literatury postyczniowej // Doświadczenie prowincji w literaturze polskiej w II połowie XIX i XX wieku. – Białystok, 1993. – S. 5–16.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm